УДК 37.091.3:811.161.3-342

# ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫВУЧЭННІ ФАНЕТЫКІ Ў ВНУ І ШКОЛЕ

**Ермакова А.М., канд. філал. навук, дацэнт**
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*

Кожны год вышэйшыя навучальныя ўстановы, іх кафедры сустракаюцца з новым студэнцкім папаўненнем. Ад таго, якую падрыхтоўку атрымалі першакурснікі ў сярэдняй школе, у вялікай ступені залежыць працэс навучаня і выхавання маладых людзей. Праблема пераемнасці паміж школай і вну заўсёды была ў ліку прыярытэтных педагагічных праблем. Выкладчыкі добра ведаюць, з якімі праблемамі сутыкаецца першакурснік, як цяжка яму адаптавацца да новых форм арганізацыі навучальнага працэсу і метадаў навучання, патрабаванняў да яго вынікаў.

Непадрыхтаванасць выпускнікоў школ да навучання ў вну найчасцей звязана з адсутнасцю ўмення выкарыстоўваць веды, набытыя ў школе. Першакурсніку здаецца, што ён пачынае з чыстага ліста. Часта ён не ўмее аналізаваць вучэбны матэрыял, супастаўляць новыя веды з набытымі ў школе, што звязана з адсутнасцю разумення логікі, паслядоўнасці і сістэмнасці навуковай тэорыі. Часта сутыкаемся з адсутнасцю цэлага шэрагу агульнанавучальных, агульнаінтэлектуальных навыкаў і ўменняў.

Падчас навучання мове вялікую ролю адыгрывае навучанне фанетыцы, бо ад якасці вымаўлення шмат у чым залежаць камунікатыўныя здольнасці чалавека.

Курс сучаснай беларускай мовы заканамерна пачынаецца з фанетыкі. Што дае вывучэнне фанетыкі як пазіцыйнай сістэмы, як фаналагічна арганізаванага цэлага? Якаснае яе засваенне дае поўнае ўяўленне аб заканамернай дакладнасці, гарманічнасці гэтай сістэмы. Цэлыя класы гукаў уступаюць у строгія, разумныя, паслядоўныя адносіны. Студэнту прадастаўляецца значны матэрыял для разважанняў, для самастойнага мысленчага працэсу. Студэнт павінен зразумець не свет прадметаў (асобных гукаў), а свет адносін, узаемадзеяння.

Фанетычны разбор слова ўваходзіць у школьную і вузаўскую праграмы. Гэты від аналізу вельмі часта выклікае цяжкасці, бо недастаткова вывучыць тэорыю (а на практыцы здараецца, што і класіфікацыі гукаў паводле ўдзелу голасу і шуму не ведаем) і ведаць усе тэрміны. Патрабуецца развіваць фанетычны і фанематычны слых. Асноўная праблема, што ўзнікае падчас фанетычнага разбору, – уздзеянне літарнай формы слова. Здараецца, што студэнт не можа абстрагавацца ад літарнага напісання і не блытаць літары з гукамі. Вельмі часта правілы фанетычнага разбору парушаюцца. Нягледзячы на тое, што пытанне пра фанетычны разбор у навуковай літаратуры распрацавана вельмі добра. Дастаткова ўспомніць працы Г.В. Гамезы, В.А. Ляшчынскай, У.Ц. Піскуна, П.В. Садоўскага, В.Д. Старычонка і інш.

Не гатовы студэнт прытрымлівацца галоўнага прынцыпу – усю ўвагу канцэнтраваць менавіта на гучанні слова, якое неабходна запісаць у транскрыпцыі. На наш погляд, праблема ў тым, што школьніка не навучылі бачыць заканамернасці, што адбываюцца ў маўленчым патоку. Фанетычныя працэсы для яго застаюцца цьмянымі, і ён спадзяецца толькі на ўласны слых. А слых гэты часта падводзіць як па прычынах сацыяльных (беларуская мова функцыянуе ва ўмовах білінгвізму), так і па суб’ектыўных (напрыклад, навучэнец на слых не адрознівае цвёрдыя і мяккія гукі).

Што рабіць? Вывучаць усе разнавіднасці асміляцыі, тлумачыць рэдукцыю і акамадацыю..? Яшчэ больш ускладняць і так няпростую школьную праграму? Школьны курс беларускай мовы з’яўляецца копіяй навуковага курса, хоць і зменшанай. Інтэнсіўнасць навучання вельмі высокая, паток інфармацыі значны. Мы ідзем па шляху назапашвання вялікіх аб’ёмаў ведаў і забываемся аб неабходнасці растлумачыць, навошта гэтыя веды, як скарыстаць іх на практыцы?

Найчасцей і веды па фанетыцы ўспрымаюцца як абстрактныя, адарваныя ад маўленчай практыкі. На наш погляд, неабходна больш увагі аддаваць выпрацоўцы фанематычнага слыху ў напасрэднай сувязі з выпрацоўкай артыкуляцыйных навыкаў. Выразная і ўсвядомленая артыкуляцыя дазваляе дакладна вымаўляць гукі, правільна чуць, іншымі словамі фанематычны слых (перцэптыўная база) не развіваецца без навыкаў правільнай артыкуляцыі (артыкуляцыйная база). Важна, каб была ўсвядомленая сувязь

паміж мяккасцю гука і адпаведнай дадатковай артыкуляцыяй (палаталізацыяй), цвёрдасцю – з велярызацыяй, пары па звонкасці-глухасці не завучваліся аўтаматычна, а звязваліся з работай галасавых звязак і прычынамі ўтварэння шуму, гучанне фрыкатыўнага і выбухнога звязвалася з месцам і спосабам утварэння і г.д. Пры гэтым няма неабходнасці завучваць складаныя тэрміны. Навучанне фанетыцы павінна праводзіцца на практыцы, неабходна паказаць і завучыць артыкуляцыю, звязаць яе з асаблівасцямі гучання.

Мы чакаем ад школы трывалых практычных ведаў, заснаваных на разуменні: устаноўкі ўсвядомленай сувязі паміж артыкуляцыяй і гучаннем, сувязі правапісу з паняццямі гук і фанема і г.д. Толькі тады будзе плён ад тэарэтычнага вывучэння фанетыкі на вузаўскім узроўні: установіцца сувязь паміж артыкуляцыяй і фанетычнымі працэсамі, стане зразумелай сігніфікатыўная і перцэптыўная функцыі фанемы…

Што ж атрымліваецца? Мы зноў просім школу ўскладніць і без таго перагружаныя праграмы? Ці, магчыма, змяніць падыход да навучання ад інтэнсіўнага назапашвання вялікага аб’ёму інфармацыі да ўсвядомленага яе засваення. Праблема не ў аб’еме праграмы, а ў мэтазгоднасці тых ці іншых ведаў.

Так, фаналогія ў школе патрабуе вялікіх намаганняў настаўніка, але вынік будзе – у правільным вымаўленні, беспамылковым напісанні, усведамленні моўных з’яў і працэсаў (не толькі фанетычных).

Працэс выкладання павінен быць накіраваны не толькі на фарміраванне трывалых прадметных ведаў, але і на ўсведамленне навучэнцамі працэсу развіцця ведаў, яго логікі і структуры, фарміравання метаведаў, як асновы навуковага светапогляду.